КУЛУАРЫ РЭАЛІЦІ-ШОУ 5





ЧАМУ ВАЖНА ДРУКАВАЦЬ ФОТАЗДЫМКІ? 13


Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. ПЯТНІЦА № 199 (30333)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«У Беларусі створаны ўсе неабходныя ўмовы для паўнавартасных мацярынства. Стабільна функцыянуе сістэма дзяржаўных дапамог. Толькі на бягучы год на фінансаванне дзяржаўнай дапамогі запланавана 3,4 млрд рублёў, з іх 1,8 млрд будзе накіравана на выплату дапамогі па доглядзе дзіцяці да трох гадоў. Сістэмай дзяржаўных дапамог ахоплена 366 тысяч, або кожнае пятае дзіця ў краіне».*

# Да спаборніцтваў гатовыя!



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Сёння ў Мінску пройдзе фінальны этап рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года». З сямі фіналістаў, якія прадстаўляюць усе рэгіёны краіны, адна з сем'яў атрымае гэты ганаровы тытул. Імёны пераможцаў сёння стануць вядомыя, а наш фотакарэспандэнт незадоўга да фіналу зрабіў здымак прадстаўнікоў сталіцы. Ірына і Дзмітрый ГРАМЫКІ настаўнічаюць у 223-й школе: ён выкладае фізкультуру, яна — англійскую мову. Там жа вучацца і малодшыя дзеці Сафія і Платон, а старэйшая Эліна, член нацыянальнай зборнай па дзюдо, займаецца ў Рэспубліканскім вучылішчы алімпійскага рэзерву. Малодшыя таксама па прыкладзе сястры ходзяць на дзюдо і ўжо маюць свае поспехі.**

**Настрой у гэтай спартыўнай сям'і перад фіналам бадзёры і баявы.**

## КОРАТКА

- **Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных сфер.**
- У планах БЧ на 2025 год — набыццё 10 магістральных цеплавозаў, 15 манеўровых цеплавозаў і 10 адзінак маторвагоннага рухомага састава.
- **Кыргызстан пашырыў таварную наменклатуру біржавога гандлю з Беларуссю.**
- У Беларусі за апошнія гады ў 10 разоў знізілася колькасць дзяцей, якія выхоўваюцца ў інтэрнатах.



- **Беларусь і Расія праводзяць перагаворы па выбудоўванні аб'яднанага рынку газу.**
- Пасля ўвядзення Беларуссю бязвізу для ЕС і шэрагу іншых дзяржаў колькасць турыстаў з Еўропы ўзрасла ўдвая.

Свет вакол нас

# ЧАС САДЗІЦЬ ДРЭВЫ

## Зрабіць гэта можа кожны ахвотны



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Азеляненне ў нашай краіне праводзіцца планава і пастаянна. Яно ажыццяўляецца для прыгажосці, а таксама для падтрымання здаровага навакольнага асяроддзя, лічыць намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці — начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Таццяна ЖАЛЯЗНОВА.**

СТАР. 3

Дзяржаўны інтарэс

# Універсальная мова якасці

## Аб развіцці стандартызацыі ў Беларусі расказалі эксперты

**Штогод 14 кастрычніка навукова-тэхнічная грамадскасць розных краін адзначае Сусветны дзень стандартызацыі. У Беларусі таксама з 2000 года адзначаецца гэтае прафесійнае свята. Асабліва значная гэта дата, як і дзейнасць у сферы стандартызацыі, у Год якасці. Бо стандарты ў сучасным свеце — універсальная мова зносін паміж распрацоўшчыкамі, вытворцамі і спажыўцамі любых тавараў і паслуг: ад прадуктаў харчавання да тэхналогій штучнага інтэлекту.**

СТАР. 4



ISSN 1990 — 763X

24199

Парламенцкі дзённік

# РАЗУМЕЦЬ НАСТРОЙ ЛЮДЗЕЙ І ПАПЯРЭДЖВАЦЬ КАНФЛІКТНЫЯ СІТУАЦЫІ

## Ігар СЕРГЯЕНКА правёў сустрэчу-семінар з памочнікамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў

**Калі дэпутаты заўсёды на відавоку, то іх памочнікі, як правіла, застаюцца ў цені. А, між іншым, на іх ляжаць сур'ёзныя абавязкі па арганізацыі дзейнасці парламентарыяў, прычым нярэдка гэта ажыццяўляецца на грамадскіх пачатках. Падчас сустрэчы-семінара памочнікаў дэпутатаў азнаёмілі з агульнымі падыходамі ў рабоце, праінфармавалі аб навацыях і патрабаваннях у інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці. Асаблівая ўвага была ўдзелена рабоце са зваротамі грамадзян і павадзінам у медыйнай прасторы — да ўсіх гэтых кірункаў памочнікі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў маюць непасрэднае дачыненне. Падобнае мерапрыемства, дарэчы, прайшло ўпершыню.**



### «Дапамагаць і словам, і справай»

Як адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА,** у Палаце прадстаўнікоў вялікая ўвага ўдзяляецца наладжванню работы рэгіянальнай дэпутацыі (мясцовай і мінскай гарадской), умацаванню іх узаемадзеяння з мясцовымі органамі ўлады. «Належны тон гэтай рабоце павінны задаць вызначаныя па ўзгадненні з кіраўніцтвам абласцей кіраўнікі дэпутацыі, — канкрэтызаваў ён, звяртаючыся да памочнікаў парламентарыяў. — Вядома, канчатковы вынік нашай работы залежыць не толькі ад дэпутатаў, а і ад вашага актыўнага ўдзелу. У тым, што ён можа і павінен быць значным, няма ніякага сумнення».

Спікер звярнуў увагу на тое, што памочнікамі дэпутатаў з'яўляюцца людзі самых розных прафесій, рознага ўзросту. «Гэта і ўмудроныя жыццёвым, прафесійным вопытам людзі, якія працавалі на розных участках сваёй службовай дзейнасці, якія ў залатым, пенсіённым, узросце вырашылі дапамагаць дэпутатам не фармальна, а на справе, — удакладніў ён. — Шмат маладых людзей. Многія знаходзяцца ў рэзерве кадраў у розных арганізацыях. Упэўнены, што вопыт работы памочнікам дэпутата спатрэбіцца вам у далейшай службовай біяграфіі».

Па словах Ігара Сергяенкі, асноўная задача ўзаемадзеяння з рэгіёнамі ў тым, што дэпутаты павінны быць разам з выбаршчыкамі, іх клопатамі і дасягненнямі, дапамагаць і словам, і справай у вырашэнні праблем, якія іх хвалююць, у каардынацыі з мясцовымі ўладамі.

«Таму вельмі важна, каб вы ведалі, што адбываецца ў рэгіёнах, каб вы разумелі настрой людзей, іх стаўленне да рашэнняў, што прымаюцца ў дзяржаве, да падзей, якія адбываюцца сёння ў гэты няпросты час, — паставіў задачы памочнікам дэпутатаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — З вашай дапамогай мы павінны прадбачыць, папярэдзіць любыя канфліктныя сітуацыі на месцах. А калі яны ўсё ж узніклі, то максімальна аператыўна на іх рэагаваць і эфектыўна вырашаць. Гэтак жа хутка і эфектыўна мы павінны навучыцца рабіць усеагульным здабыткам нават самы нязначны станоўчы вопыт (і такіх прыкладаў у нас у краіне шмат), рэалізацыя якога ў маштабах краіны здольная прынесці значны пазітыўны эфект».

Для вырашэння гэтых задач, па словах спікера, патрэбны дасканалы маніторынг і аналіз сацыяльна-палітычнай, эканамічнай сітуацыі, якая складваецца ў выбарчых акругах. Багаты матэрыял для выканання гэтай работы даюць сустрэчы дэпутатаў з працоўнымі калектывамі, навучэнскай моладдзю, ветэранамі, грамадскімі аб'яднаннямі. І тут, як адзначыў Ігар Сергяенка, немалаважную, вядучую ролю ў арганізацыі не толькі гэтых мерапрыемстваў, але ў атрыманні падобнай інфармацыі іграюць памочнікі дэпутатаў, якія камунікуюць з выбаршчыкамі, працуюць у канкрэтных арганізацыях.

### «Не варта пазбягаць вострых тэм»

Важнымі складнікамі ўмацавання даверу народа да ўлады, як падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў, з'яўляюцца ўважлівыя адносіны да людзей, да іх праблем, асабісты ўдзел у вывучэнні і вырашэнні якіх павінны браць дэпутаты і іх памочнікі. Невыпадкова асаблівую ўвагу ў рабоце са зваротамі грамадзян даручана звярнуць на паўторныя выпадкі зваротаў грамадзян. «Паўторныя звароты грамадзян — гэта сігнал, які сведчыць аб тым, што мы не вырашаем з першага або другога разу тыя ці іншыя сітуацыі, — канстатаваў спікер. — Гэта можна разглядаць як факты надзвычайнага характару, якія патрабуюць неадкладнага рэагавання. Гэта таксама зона вашай адказнасці». У гэтай сувязі пастаўлена задача неадкладна накіроўваць інфармацыю аб сістэмных праблемах, якія патрабуюць вырашэння, у Палату прадстаўнікоў.



Ігар Сергяенка праінфармаваў, што адзін тыдзень у месяц кожны дэпутат праводзіць у сваёй акрузе. Пасля вяртання рыхтуецца справаздача, у якой адлюстроўваецца не толькі зробленае парламентарыем у гэты перыяд, указваюцца праблемы, якія патрабуюць прыняцця канкрэтных рашэнняў, мер рэагавання. Усе гэтыя звесткі выкарыстоўваюцца для інфармавання Прэзідэнта, дзяржаўных органаў. Акцэнтуючы на гэтым увагу, Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што інфармацыя, якая прадстаўляецца ў тым ліку памочнікамі дэпутатаў, павінна быць і актуальнай, і аб'ектыўнай.

Асобна падчас сустрэчы-семінара закранулася тэма ўзаемадзеяння са сродкамі масавай інфармацыі, інфармацыйнага суправаджэння, якое ў сувязі з электаральнай кампаніяй, па словах Ігара Сергяенкі, будзе нарастаць. «І мы павінны тут не толькі суправаджаць, але і сваім адказным словам даваць адпор, — заўважыў ён. — Не варта пазбягаць вострых тэм. Калі мы не будзем рэагаваць на вострыя тэмы, то за нас гэта будуць рабіць іншыя».

З дакладам аб агульных падыходах у рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб выступіў начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта Рыгор Шлык. Дацэнт кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ Аляксандр Градзюшка расказаў аб метадах і формах сучаснай работы ў сацыяльных сетках. Прагучалі выступленні і на іншыя тэмы, якія маюць вялікае значэнне ў рабоце памочнікаў дэпутатаў, аб чым сведчыла вялікая колькасць пытанняў. А гэта значыць, што першая сустрэча-семінар з памочнікамі дэпутатаў у Палаце прадстаўнікоў была эфектыўнай. Больш за тое, мяркуючы па двухбаковай зацікаўленасці падобнага дыялогу, можна казаць, што падобнае мерапрыемства стане традыцыйным.

* * *

Як падзялілася ў размове з журналістамі **памочнік дэпутата Таццяна ПАЎЛОЎСКАЯ,** яна засталася пад уражаннем ад сустрэчы-семінара. «Для мяне гэтае мерапрыемства вельмі важнае, бо я выбрана памочнікам дэпутата першы раз, і ўсё гэта для мяне новае, — сказала яна. — Перш за ўсё цікавілі тыя формы работы, якія мы павінны прымяняць падчас камунікацыі з насельніцтвам. Карысным было даведацца і аб аспектах узаемадзеяння са сродкамі масавай інфармацыі».

Па словах **памочніка дэпутата Паўла ЖДАНОВІЧА,** падобныя мерапрыемствы вельмі неабходныя для павышэння кампетэнцый памочнікаў дэпутатаў. «Працэс адукацыі бесперапынны, — лічыць ён. — Новыя тэндэнцыі, якія сёння існуюць, як у заканадаўчай сферы, так і ў сферы ўзаемадзеяння са СМІ, патрабуюць у тым ліку адукацыйнага кантэнту. Некаторыя памочнікі дэпутатаў выконваюць сваю дзейнасць на прафесійнай аснове, некаторыя — на грамадскіх пачатках. І, вядома, усачыць за многімі момантамі вельмі складана ў нашым хуткім інфармацыйным патоку. Таму такая канцэнтраваная інфармацыя па пэўных кірунках, якая даецца ў межах такіх адукацыйных семінараў, вельмі карысная і неабходная для ажыццяўлення той дзейнасці, якая ўскладзена на памочнікаў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ЗША не хапае сродкаў для барацьбы з прыроднымі катастрофамі



Злучаныя Штаты маюць вялікія фінансавыя праблемы, звязаныя з пераадоленнем наступстваў прыродных бедстваў. Пра гэта паведаміла РІА «Новости», спасылаючыся на Atlantic. «Кожны раз краіне ўдаецца звесці канцы з канцамі і знайсці дадатковыя сродкі на дапамогу тым, хто мае патрэбу. Аднак у нейкі момант выдаткі стануць проста непад'ёмнымі ці ператворацца ў норму», — адзначаецца ў артыкуле. З-за сур'ёзных кліматычных змен ЗША паграджаюць новыя прыродныя катаклізмы, на барацьбу з якімі спатрэбяцца мільярды долараў. «Такая неадпаведнасць паміж катастрофамі, на барацьбу з якімі ўрад выдзеліў грошы з бюджэту, і рэальнымі наступствамі ад маштабных стыхійных бедстваў адбываецца пастаянна», — паведаміла Atlantic. Міністр унутранай бяспекі ЗША Аляксандра Маёркас раней заявіў, што ў Федэральнага агенцтва па кіраванні ў надзвычайных сітуацыях (FEMA) недастаткова сродкаў для барацьбы з наступствамі разгулу стыхіі на цяперашні тэрмін сезона ўраганаў.

### У Германіі ўдвая ўзрасла колькасць злачынстваў на глебе антысемітызму



У Германіі колькасць злачынстваў на глебе антысемітызму з моманту атакі палестынскага руху ХАМАС на Ізраіль 7 кастрычніка мінулага года ўзрасла ў два разы, склаўшы ў цэлым 3200 правапарушэнняў. Аб гэтым паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на даныя даклада Міністэрства ўнутраных спраў ФРГ. МУС зазначае, што колькасць антысеміцкіх злачынстваў, звязаных з блізкаўсходнім канфліктам, «трывожна вялікая». «Розныя экстрэмісцкія рухі выкарыстоўваюць антысемітызм і варожасць да Ізраіля ў сваіх мэтах. Асаблівая ўвага органаў бяспекі прыкавана да ісламізму», — дадалі ў ведамстве. Раней кіраўнік Федэральнага ведамства па ахове канстытуцыі Германіі, якое займаецца ўнутранай разведкай, Томас Хальдэнванг папярэдзіў аб рызыцы росту антысеміцкіх пратэстаў.

### Магнітныя буры на Зямлі ўзмацніліся з-за ўздзеяння каранальнай дзіркі на Сонцы



Магутныя ўспышкі і ўтварэнне каранальнай дзіркі на Сонцы ўзмацнілі магнітныя буры на Зямлі. Пра гэта паведамілі ў лабараторыі сонечнай астраноміі Інстытута касмічных даследаванняў РАН і Інстытута сонечна-зямной фізікі. «Бягучы бал падзеі — G3, гэта значыць, узровень 3 па 5-бальнай сістэме», — падкрэсліваецца ў паведамленні, апублікаваным на сайце лабараторыі. Адзначаецца, што ўзмацненне буры звязана з уздзеяннем буйной каранальнай дзіркі памерам каля 300 тысяч кіламетраў, якая ўтварылася ў паўночным паўшар'і Сонца. «Гэта не азначае бесперапынныя буры, але ў цэлым моцна павышае агульную нестабільнасць геамагнітнай абстаноўкі», — адзначылі вучоныя. Пад каранальнымі дзіркамі маюцца на ўвазе буйныя сонечныя вобласці з адкрытымі лініямі міжпланетнага поля, уздоўж якіх плазма мае магчымасць бесперашкодна сыходзіць у міжпланетную прастору, растлумачылі спецыялісты.

# ЧАС САДЗІЦЬ ДРЭВЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кожнае дрэва выконвае сваю непасрэдную функцыю: узбагачае паветра кіслародам, астуджае вуліцы і гарады, зніжае загазаванасць, адзначыла спецыяліст. Азеляненне гарадоў — гэта цэлы комплекс работ, якія накіраваны на добраўпарадкаванне прасторы і паляпшэнне экалагічнай абстаноўкі нашага асяроддзя пражывання. На землях агульнага карыстання азеляненне праводзіцца мясцовымі ўладамі, праз спецыялізаваныя арганізацыі. Спрыяльным часам для пасадкі саджанцаў дрэў і кустоў з'яўляюцца вясновы і восеньскі перыяды. Як правіла, гэты час з сакавіка па май, а таксама — з кастрычніка па лістапад, так што зараз самы час. Пры высадцы зялёных насаджэнняў неабходна ўлічваць падбор парод. Таксама спецыялізаваныя арганізацыі абавязаны праводзіць знішчэнне інвазіўных раслін.

Таццяна Жалязнова падкрэсліла, што кожны жыхар горада можа прыняць удзел у азеляненні і пасадзіць дрэва. Для гэтага неабходна звярнуцца ў мясцовы выканаўчы камітэт або іншы орган для таго, каб арганізаваць гэта з улікам усіх патрабаванняў заканадаўства.



**Пасадачны матэрыял для азелянення беларускай сталіцы вырошчвае спецыяльны гадавальнік Мінскзелянбуда. Там разводзяць расліны, якія прыдатныя для нашых шырот і добра сябе зарэкамендавалі ў прыжывальнасці і далейшым росце. Каб вырасціць з высадкі зялёнага «волата», трэба ад 7 да 15 гадоў, у залежнасці ад пароды дрэва.**

У нашай краіне нарматыў азелянення населеных пунктаў складае 40 %. У некаторых раёнах краіны цяпер ён дасягае 60 % і нават 65 %. Напрыклад, у рамках рэалізацыі рэспубліканскага плана па навядзенні парадку на зямлі ў мінулым годзе было пасаджана больш як 300 тысяч дрэў і больш як 500 тысяч кустоў у населеных пунктах краіны. За гэты час плошча азяленених тэрыторый у рэспубліцы павялічылася на 901 тысячу гектараў. А нарматыў азелянення (звыш 40 %) выконваецца больш чым у 130 гарадах і раённых цэнтрах краіны, — лічы, ва ўсіх.

Ужо сёлета было пасаджана звыш 200 тысяч дрэў і больш за 300 тысяч кустоў. Зроблена азеляненне ўздоўж рэспубліканскіх аўтамабільных дарог. Там пасаджана 14 тысяч дрэў і больш чым 35 тысяч кустоў.

## Мінск — зялёны горад

І гэта сапраўды так, бо азеляненне сталіцы, па словах **старшыні Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Валянціна ШАТРАЎКІ,** складае 42,1 % пры нарматыве для населеных пунктаў 40 %. Найбольш зялёным раёнам з'яўляецца Партызанскі — звыш 69 %, найменш — Кастрычніцкі — 24 %.

Спецыяліст адзначыў, што месячнік па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку праходзіць у Мінску з 1 кастрычніка, а з 15-га пачнуцца актыўныя высадкі дрэў і кустоў. Валянцін Шатраўка заклікаў жыхароў сталіцы далучыцца да гэтай добрай справы.

Ён таксама расказаў, колькі новых зялёных насаджэнняў ужо з'явілася ў сталіцы сёлета. За студзень — верасень гэтага года высаджана больш за 21 тысячу дрэў і звыш 175 тысяч кустоў, праведзена рэканструкцыя і рамонт 264 гектараў газонаў. Для параўнання: летась у рамках плана па навядзенні парадку на зямлі, добраўпарадкаванні і азеляненні ў сталіцы высадзілі звыш 49 тысяч дрэў, 355 тысяч кустоў, праведзена ў парадак 270 гектараў газонаў.

«Актыўны ўдзел у высадцы дрэў і кустоў прымае насельніцтва, — лічыць Валянцін Шатраўка. — Так, у праекце «Зялёны двор разам» узялі ўдзел больш як 3 тысячы гараджан».

Аднак добраўпарадкаванне не заканчваецца на высадках зялёных насаджэнняў. Не менш важным этапам з'яўляецца належны догляд.

## Каб дрэвы не былі ветразямі

Якія мерапрыемствы праводзіць горад у восеньскі перыяд для падрыхтоўкі да зімовага, распавялі прадстаўнікі «Мінскзелянбуда».

Па іх словах, у першую чаргу выконваецца абкручванне ствалоў дрэў і ўсталёўваюцца спецыяльныя экраны для абароны ад уздзеяння супрацьгалалёдных рэагентаў у зімовы перыяд. «У асноўным такія работы праводзяцца на дрэвах і хмызняках, якія растуць у непасрэднай блізкасці ад аўтадарог. Таксама хаваем хмызнякі ад прамярзання. У восеньскі перыяд выконваецца і ачыстка газонаў ад лістоты», — удакладніла **кіраўнік службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі «Мінскзелянбуда» Наталля ЛІСОЎСКАЯ.**

Паралельна работнікі гаспадарак гэтымі днямі займаюцца рамонтам кветнікаў, абнаўляюць пры неабходнасці скрыні з раслінамі, устаноўленыя на агароджах раздзяляльных палос. Да фіналу таксама набліжаецца ўладкаванне новых зон адпачынку. Па адной лакацыі плануюць адкрыць у кожным раёне сталіцы.

Усяго ж восенню бягучага года «Мінскзелянбуд» мае намер высадзіць каля 10 тысяч дрэў і 100 тысяч хмызняковых насаджэнняў. Пры выбары пасяўнога матэрыялу стаўку рабілі на ўстойлівасць раслін да засалення глебы зімой. З дрэў выбралі ясень — ён найбольш устойлівы да неспрыяльных умоў.

Акрамя таго, у восеньскі перыяд спецыялісты зялёнай гаспадаркі працягнуць абразанне дрэў. Гэта мера дапамагае памяншаць парусnasць зялёных насаджэнняў, а таксама папярэдзіць іх падзенне ў выпадку ўраганных вятроў.

Як адзначаюць спецыялісты «Мінскзелянбуда», не прыжываюцца толькі 2-3 % ад агульнага аб'ёму раслін, якія высаджваюцца. У першыя 2-3 гады за маладымі пасадкамі арганізоўваюць асаблівы догляд. Толькі для паліву кожнага пасаджанага дрэўца выкарыстоўваецца каля 30 літраў вады ў засушлівыя дні лета.

Пасадачны матэрыял для азелянення беларускай сталіцы вырошчвае спецыяльны гадавальнік Мінскзелянбуда. Там разводзяць расліны, якія прыдатныя для нашых шырот і добра сябе зарэкамендавалі ў прыжывальнасці і далейшым росце. Каб вырасціць з высадкі зялёнага «волата», трэба ад 7 да 15 гадоў, у залежнасці ад пароды дрэва.

У Мінску ўвесь комплекс работ па добраўпарадкаванні тэрыторыі горада выконваюць каля 2500 рабочых зялёнага будаўніцтва. Спярша наводзяць чысціню ўздоўж праспектаў і іншых цэнтральных аб'ектаў, а затым паступова на астатніх зонах.

Як адзначыла **намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі КУП «Мінскзелянбуд» Кацярына КАРОТКІНА,** за прадпрыемствам замацаваны найбольш важныя аб'екты сталіцы: Нацыянальная бібліятэка, плошча Перамогі, праспект Пераможцаў, вуліца Прытыцкага, Палац спорту, парк Янкі Купалы...

**У нашай краіне нарматыў азелянення населеных пунктаў складае 40 %. У некаторых раёнах краіны цяпер ён дасягае 60 і нават 65 %. Напрыклад, у рамках рэалізацыі рэспубліканскага плана па навядзенні парадку на зямлі ў мінулым годзе было пасаджана больш як 300 тысяч дрэў і больш як 500 тысяч кустоў у населеных пунктах краіны. За гэты час плошча азяленених тэрыторый у рэспубліцы павялічылася на 901 тысячу гектараў. А нарматыў азелянення (звыш 40 %) выконваецца больш чым у 130 гарадах і раённых цэнтрах краіны, — лічы, ва ўсіх.**

Паўсюдная прыборка лісця пачынаецца пасля масавага ападу — у сярэдзіне або канцы кастрычніка. Кусты і іглічныя дрэвы трэба высадзіць да канца кастрычніка. А з лістапада пачнуць саджаць лістоўныя дрэвы. Усё залежыць ад надвор'я. Кожны год восень прыходзіць па-рознаму.

Прыборка апалага лісця — не толькі дзеля прыгажосці, але і дзеля бяспекі людзей. Калі гэтага не рабіць, то падаліца намокне пад дажджом, стане прычынай дарожна-транспартных здарэнняў і траўмаў людзей. Акрамя таго, яна забівае ліўневую каналізацыю і можа прывесці да падтаплення вуліц.

Апалае лісце прыбіраюць да пяці метраў ад праезнай часткі. У скверах, на бульварах, азяленених тэрыторыях уздоўж праспектаў збіраюць яго цалкам. У парках — да дзесяціметровай зоны ад дарожак, а таксама ачышчаюць ад лісця месцы вакол атракцыёнаў, уваходныя зоны.

А яшчэ важна прыбіраць апалае лісце з праспектаў і газонаў, бо за лета яно назапашвае выхлапныя газы, розныя шкодныя элементы. Калі яго пакінуць перагніваць, то гэтыя рэчывы трапяць у глебу.

Калі тэмпература паветра ў дзённыя гадзіны трымаецца на ўзроўні нуля — плюс пяці градусаў, у горадзе ўздоўж праспектаў і вуліц пачынаюць абвязваць ствалы дрэў спанбондам. Шматгадовыя кветкі і ружы ўкрываюцца іглічнымі галінкамі для абароны ад вымярзання і траплення рэагентаў.



## Перавагі восеньскай пасадкі

Клопатаў восеньская пасадка даставіць няшмат — можна абмежавацца адным палівам, а прырода сама даробіць астатняе. Восеньскае надвор'е і дажджы забяспечаць саджанцам неабходную вільготнасць глебы і камфорт. Нягледзячы на надыходзячы перыяд спакою, карані дрэўца працягваюць расці, пакуль глеба не астыне да тэмпературы плюс 4. Своечасова пасаджаныя расліны да наступлення ўстойлівых замаразкаў ужо паспеюць вырасціць тоненькія карэньчыкі і ў новым сезоне кранучца ў рост на цэлых два, а то і тры тыдні раней тых саджанцаў, што пасадзілі вясной.

Асабліва спрыяльная восеньская пасадка ў паўднёвых рэгіёнах, дзе зімы цяплейшыя. Зямля там не прамярзае на глыбіню залягання каранёў, і маладым дрэўцам не пагражае пераахаладжэнне і вымярзанне.

## Якая карысць ад дрэў у горадзе?

Дрэвы чысцяць паветра ад мікрачасцінак пылу і сажы ад прамысловых прадпрыемстваў, электрастанцый і выхлапаў аўтамабіляў. Пыл і сажа асядаюць на лісці дрэў, а затым змываюцца дажджамі або застаюцца на месцы да восеньскага лістапада.

Для людзей гэтыя мікрачасцінкі зусім не бяскрыўдныя: яны правакуюць развіццё хвароб органаў дыхання і крывяноснай сістэмы, могуць прыводзіць да парушэнняў у рабоце нервовай сістэмы, узмацняць многія хранічныя хваробы. Чысцячы паветра ад пылу і сажы, дрэвы робяць гарадское асяроддзе значна больш спрыяльным і бяспечным для жыцця людзей.

Дрэвы добра паглынаюць шум, зніжаючы ўзровень шумавога забруджвання ўздоўж вуліц і дарог і ствараючы ў гарадскіх парках і лясах ціхія месцы адпачынку. Гэта таксама вельмі важна: шум — адна з галоўных крыніц пастаяннага стрэсу ў гараджан, які прама ўплывае на здароўе і працягласць жыцця. Чым ніжэйшы ўзровень шумавога забруджвання і чым больш у людзей магчымасцяў пагуляць у цішыні сярод дрэў, тым лепш і даўжэй яны жывуць.

Дрэвы ўвільгатняюць і астуджаюць паветра ў перыяды моцнай спёкі, а таксама ствараюць цень. Розніца ў тэмпературы паветра на добра азяленених вуліцах і на вуліцах без зялёных насаджэнняў у летні сонечны дзень можа дасягаць некалькіх градусаў — гэта крытычна важна для людзей, асабліва пажылых, або якія маюць праблемы са здароўем. А цень — гэта абарона ад сонечных удараў і ад лішку ўльтрафіялету, такім чынам — зніжэнне рызыкі раку скуры.

Многія дрэвы, асабліва іглічныя, вылучаюць фітанцыды — лятучыя рэчывы, якія затрымліваюць развіццё хваробатворных бактэрый. Гэта робіць паветра больш здаровым, хоць бы часткова стрымліваючы распаўсюджванне некаторых інфекцыйных захворванняў, што таксама ўплывае і на здароўе, і на працягласць жыцця людзей.

Дрэвы (і ў цэлым зялёныя насаджэнні) робяць гарады прыгожымі і прывабнымі для жыцця. Калі прыгажосць сапраўды калі-небудзь выратуе свет, то роля гарадскіх дрэў у гэтым будзе дакладна не самай апошняй.

**Сяргей КУРКАЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# Універсальная мова якасці

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Наяўнасць стандартаў, дзяржаўных і міждзяржаўных, дапамагае спрасціць і ўпарадкаваць пытанні, якія могуць стаць складанымі і хаатычнымі, калі не мець дакладных «кропак апоры» для ацэнкі тавараў і паслуг. Прасцей кажучы, стандарты — гэта набор найважнейшых крытэрыяў, якім павінна адпавядаць прадукцыя ў пэўнай катэгорыі. Штогод у свеце Дзень стандартызацыі праходзіць пад пэўным дэвізам. Гэты год працягвае тэму «Стандарты для дасягнення Мэт устойлівага развіцця», і ў 2024-м сярод гэтых мэт выбрана «Індустрыялізацыя, інавацыі і інфраструктура» з акцэнтам на развіццё штучнага інтэлекту.



## АД БЕЗБАР'ЕРНАГА АСЯРОДДЗЯ ДА ЗЯЛЁНАЙ ЭКАНОМІКІ

У Беларусі 2024 год аб'яўлены Годам якасці, а стандарты ляжаць у аснове якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі і паслуг, падкрэсліла **старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Алена МАРГУНОВА.**

— Чым больш прагрэсіўны ўзровень патрабаванняў стандартаў, тым лепшая і больш канкурэнтаздольная прадукцыя, тым вышэйшая яе якасць, — адзначыла кіраўнік Дзяржстандарта. — Стандарты аказваюць значнае станоўчае эканамічнае ўздзеянне, якое стымулюе распрацоўку новай прадукцыі і ўдасканаленне існуючай, спрыяючы развіццю рынку і ўмоў паставак.

Сёння ў Беларусі фонд дзеючых стандартаў налічвае 32 тысячы, паведаміла кіраўнік Дзяржстандарта. Толькі ў бягучым годзе ў нашай краіне было зацверджана 614 нацыянальных і міждзяржаўных стандартаў, якія датычацца лёгкай, хімічнай прамысловасці, электратэхнікі і радыёэлектронікі, машынабудавання, сельскай гаспадаркі і будаўніцтва. Узровень гарманізацыі з міжнароднымі патрабаваннямі складае 60—80 %, дадала вучоны. У рамках ЕўрАзЭС сёння беларуская стандартызацыя лічыцца самай прагрэсіўнай, падкрэсліла яна.

У бягучым годзе зацверджана Праграма стандартызацыі ў галіне тавараў і паслуг для дзяцей да 2028 года.

— Тавары для дзяцей уваходзяць у сферу прымянення тэхнічных рэгламентаў ЕўрАзЭС, аднак ёсць частка прадукцыі, не ахопленая гэтымі патрабаваннямі. І, адпаведна, пад яе не распрацаваны стандарты. Гэта спартыўны інвентар, спартыўнае абсталяванне, дзіцячая артапедычная прадукцыя і паслугі для дзяцей. Праграма ўключае распрацоўку 55 новых стандартаў, — сказала Алена Маргунова.

У 2023 годзе быў распрацаваны комплекс з 16 стандартаў, накіраваны на гарантаванне бяспекі і якасць паслуг у плавальных басейнах і аквапарках, паведаміла спікер. Гэтыя стандарты ўведзены ў дзеянне з 1 чэрвеня 2024 года. Іх наяўнасць спрыяе бяспецы, скарачэнню няшчасных выпадкаў на вадзе і дапамагае персаналу эфектыўна выконваць свае абавязкі.

Акрамя таго, у мінулым годзе былі рэалізаваны яшчэ дзве праграмы распрацоўкі дзяржаўных стандартаў: 8 стандартаў у сферы інавацыйнага менеджменту і 11 — у галіне лічбавай эканомікі. На найбліжэйшую перспектыву — да 2030 года — запланавана распрацоўка 208 стандартаў, накіраваных на садзейнічанне дасягненню Мэт устойлівага развіцця.

Да канца года завяршыцца распрацоўка 80 стандартаў у галіне ахovы навакольнага асяроддзя, якасці вады, перапрацоўкі другасных матэрыялаў. Распрацоўкі выконваюцца ў рамках Нацыянальнага плана дзеянняў па развіцці зялёнай эканомікі. Распрацавана і ўведзена ў дзеянне з 1 кастрычніка бягучага года серыя з 12 стандартаў у галіне вытворчасці і выкарыстання цвёрдага паліва з камунальных адходаў.

Адным з важных напрамкаў работы сферы стандартызацыі ў галіне сацыяльнай палітыкі стала распрацоўка стандартаў для асоб з інваліднасцю.

— Работа накіравана на тое, каб даць такім людзям больш магчымасцяў для асобаснага і прафесійнага развіцця, забяспечыць іх удзел у жыцці грамадства, — падкрэсліла Алена Маргунова.

Яна расказала, што ўжо распрацавана серыя стандартаў, якія ўстанаўліваюць тэхнічныя патрабаванні да працоўных месцаў для інвалідаў.

Важна не толькі распрацоўваць новыя стандарты, але і адсочваць актуальнасць дзеючых, дадала эксперт. З гэтай мэтай рэгулярна (раз на пяць гадоў) праводзіцца праверка навукова-тэхнічнага ўзроўню дзеючых стандартаў для прыняцця рашэння аб іх далейшым выкарыстанні або неабходнасці іх актуалізацыі.

— План дзяржаўнай стандартызацыі на 2024 год прадугледжвае ацэнку навукова-тэхнічнага ўзроўню 613 стандартаў, — падвяла вынік кіраўнік Дзяржстандарта. — Гэта стандарты ў галіне лёгкай прамысловасці, пажарнай бяспекі, аховы здароўя, харчовай прадукцыі, лесаматэрыялаў.

Крок даволі амбіцыйны, заўважыла яна. Для параўнання: у 2022 годзе колькасць стандартаў «на праверку» была амаль напалову меншая — 320.

## НІЧОГА, АКРАМЯ КАРЫСЦІ

— Гарманічнае развіццё і нават само існаванне такой галіны, як харчовая, немагчыма без стандартызацыі, — адзначыла **першы намеснік старшыні канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Таццяна ШАДКО.**

Менавіта наяўнасць стандартаў дае магчымасць пакупніку зрабіць усвядомлены выбар: гарантуе якасць прадукту і адпаведнасць яго таму, што заяўлена на ўпакоўцы. Таму канцэрн цесна ўзаемадзейнічае з органамі стандартызацыі па ўстанаўленні навукова абгрунтаваных патрабаванняў і ўдасканаленні ўжо існуючых, распрацоўцы методык ацэнкі і кантролю. Гэта работа вядзецца ў адпаведнасці з Праграмай «Якасць» на 2021—2025 гады, а таксама з Праграмай павышэння якасці ў рамках Года якасці.

— Прадпрыемствы, якія ўваходзяць у канцэрн, на 90 % выпускаюць прадукцыю, якая адпавядае або дзяржаўным, або міждзяржаўным стандартам, і на 10 % — па тэхнічных умовах. Але і прадукцыя па тэхнічных умовах праходзіць абавязковую экспертызу якасці, — звярнула ўвагу Таццяна Шадко. — Калі міждзяржаўныя стандарты прад'яўляюць менш жорсткія патрабаванні, вытворца аддае перавагу дзяржаўнаму стандарту — такім чынам гэта адбываецца па алкагольнай, сокавай прадукцыі, рапсавым алеі і шакаладзе.

З 2008 года распрацавана і ўдасканалена каля 400 стандартаў за кошт інвестыцыйнага фонду канцэрна «Белдзяржхарчпрам», паведаміла эксперт. Канцэрнам ініцыіраваны і распрацаваны Змяненні да «Тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза аб бяспецы харчовай прадукцыі»: уведзены больш жорсткія патрабаванні на шакалад і шакаладныя вырабы. Прадстаўнікі канцэрна бяруць удзел у 16 нацыянальных камітэтах па стандартызацыі і ўваходзяць у склад больш як 30 міжнародных камітэтаў, каб праводзіць палітыку падтрымання дастойнага ўзроўню айчыннай харчовай прадукцыі і каб высокія беларускія стандарты трансфармаваліся ў міждзяржаўныя, падкрэсліла спікер.

— У гэтым годзе працуем над шасцю дзяржаўнымі стандартамі ў галіне кандытарскіх вырабаў і шакаладу і адным міждзяржаўным — на кандытарскую, шакаладную і тлушчавую глазуру, — паведаміла яна.

Найважнейшы кірунак работы канцэрна ў галіне стандартызацыі звязаны з дзіцячым харчаваннем.

— Працуем над стандартамі на сокавую прадукцыю для дзіцячага харчавання і на кансервы фруктовыя, — распавяла прадстаўнік «Белдзяржхарчпрама».

Важна ўдзяліць больш увагі распрацоўцы стандартызаваных метадаў ацэнкі адпаведнасці і кантролю, дадала Таццяна Шадко. Сёння ў харчовай прамысловасці выкарыстоўваюцца біялагічна актыўныя рэчывы і ферменты, якія пакуль не маюць інструментальных метадаў ацэнкі.

— Адпаведнасць у гэтым выпадку мы вызначаем не інструментальнымі метадамі, а па колькасці, якая была выкарыстана для вытворчасці таго ці іншага прадукту, — распавяла эксперт. — У далейшым гэтыя падыходы будзем удасканальваць.



Калі ў харчовай прамысловасці роля стандартаў бясспрэчная, то пытанні якасці і бяспекі тавараў лёгкай прамысловасці айчынны спажывец часам недаацэньвае, сказала **намеснік старшыні канцэрна «Беллегпрам» Наталля МУРАШКА.** Часам мы не задумваемся, з чым кантактуе наша цела, якое адзенне мы носім, на якой пасцельнай бялізне спім. Між тым у свеце даўно прыйшлі да высновы, што гэта таксама моцна ўплывае на здароўе чалавека.

— Чаму прадукцыя беларускай лёгкай прамысловасці пастаўляецца ў каля ста краін свету? Дзякуючы яе якасці! — падкрэсліла прадстаўнік канцэрна «Беллегпрам».

Канцэрн удзельнічае ў фарміраванні абавязковых патрабаванняў да прадукцыі лёгкай прамысловасці ў тэхнічных рэгламентах. Уся прадукцыя гэтай сферы, што вырабляецца ў Рэспубліцы Беларусь, адпавядае тэхнічным рэгламентам Мытнага саюза. На базе Цэнтра навуковых даследаванняў лёгкай прамысловасці функцыянуе тэхнічны камітэт ТК BY 12 «Лёгкая прамысловасць», у канцэрна ёсць каля 20 выпрабавальных лабараторый, і практычна на ўсіх прадпрыемствах «Беллегпрама» сертыфікавана сістэма менеджменту якасці СТБ ІСО 9001, паведаміла эксперт.

— Мы маем сваю галіновую праграму «Якасць» 2021—2025, і яе асноўная мэта — забяспечыць стабільна высокую якасць і канкурэнтаздольнасць нашай прадукцыі, — падсумавала яна.

## «ПАВАДОК» ДЛЯ ШТУЧНАГА ІНТЭЛЕКТУ

Калі казаць пра перспектывы развіцця стандартызацыі ў Беларусі, то сёння сфера інтарэсаў спецыялістаў гэтай галіны — тэхналогіі штучнага інтэлекту.

— У нашай краіне запланавана стварэнне Інстытута штучнага інтэлекту, а ў праекце Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця да 2040 года акцэнт зроблены на развіццё краіны з прымяненнем тэхналогій ШІ ў розных галінах: ахова здароўя, адукацыя, прамысловасць, энергетыка, транспарт, сельская гаспадарка, турызм, ЖКГ, гандаль, культура, сфера фінансавага рынку, — адзначыла **начальнік упраўлення тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі Дзяржстандарта Аксана ГРЫШКЕВІЧ.** — Стандартызацыя неабходна пры ўкараненні штучнага інтэлекту ва ўсіх гэтых сферах. Пакуль мы ў пачатку шляху, і першым крокам стала ўвядзенне ў 2024 годзе ў нашай краіне 12 нацыянальных стандартаў на сістэмы штучнага інтэлекту на аўтамабільным транспарце для вытворчасці і выпрабавання беспілотных транспартных сродкаў.

У далейшых планах спецыялістаў — укараненне перадавых міжнародных практык і стандартаў, якія забяспечаць трывалую аснову для развіцця ШІ-тэхналогій у нашай краіне, дадала яна.

— Сёння экспертнай пляцоўкай, дзе працуюць эксперты 66 краін свету, з'яўляецца Міжнародны тэхнічны камітэт па стандартызацыі пры Міжнароднай арганізацыі па стандартызацыі, — адзначыла спецыяліст. — Беларусь у асобе ААТ «Гіпрасувязь» пакуль прысутнічае там у якасці назіральніка. У нас у планах — вызначыць наш Нацыянальны тэхнічны камітэт па стандартызацыі ТК BY 38 «Лічбавая трансфармацыя» ў якасці экспертнай пляцоўкі для распрацоўкі стандартаў у галіне штучнага інтэлекту ў Рэспубліцы Беларусь.

На 2025 год запланавана распрацоўка дзяржаўнага стандарту на аснове міжнароднага стандарту 42001 2023 года на сістэмы менеджменту ў сферы штучнага інтэлекту, паведаміла вучоны. Гэты стандарт забяспечыць этычнае, адказнае і бяспечнае выкарыстанне тэхналогій ШІ, дапаможа арганізацыям хутка адаптавацца да развіцця штучнага інтэлекту, мінімізаваць рызыкі і павысіць давер да гэтых сістэм.

— З Нацыянальнай акадэміяй навук і Міністэрствам сувязі сёння абмяркоўваецца пытанне па распрацоўцы дзесяці дзяржстандартаў на аснове міжнародных у сферы ШІ, — распавяла Аксана Грышкевіч. — Яны накіраваны на бяспеку сістэм штучнага інтэлекту для людзей і навакольнага асяроддзя.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Прэм'ера

# «ПАТЭТЫЧНЫ ДЗЁННІК ПАМЯЦІ» — НА САЦЫЯКУЛЬТУРНЫМ

**Тэлеканал «Беларусь 3» рыхтуе тэлеверсію маштабнага вакальна-харэаграфічнага праекта Вялікага тэатра Беларусі «Патэтычны дзённік памяці», якую прадставіць гледачам ужо ў нядзелю.**

Прэм'ерныя паказы маштабнага спектакля «Патэтычны дзённік памяці», прымеркаванага да 80-годдзя вызвалення Беларусі, прайшлі 22 і 27 верасня ў Вялікім тэатры Беларусі. Праект стаў адной з самых знакавых і доўгачаканых культурных падзей. «Дзённік...» адлюстроўвае гісторыю краіны ў трагічны перыяд Вялікай Айчыннай вайны праз гісторыю самога тэатра. Пачынаючы з даваеннага часу (адпраўным пунктам стаў 1939 год, калі Вялікі тэатр здабыў уласны будынак на Траецкай гары), праз страшныя гады акупацыі творчая група разам з гледачамі пракладае шлях да вызвалення нашай краіны ў 1944-м і Вялікай Перамогі.

Над праектам Вялікага працавалі ўсе калектывы тэатра — задзейнічана каля 300 чалавек. Рэжысёрам, аўтарам канцэпцыі і лібрэта «Патэтычнага дзённіка памяці» з'яўляецца Ганна Маторная. Аўтар музычнай рэдакцыі — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Алег Хадоска.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Наступны паказ «Патэтычнага дзённіка памяці» адбудзецца 1 мая 2025 года на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Раней была анансаваная дата 5 кастрычніка 2024 года.

А ў эфіры тэлеканала «Беларусь 3» убачым тэлеверсію «Патэтычнага дзённіка памяці» 13 кастрычніка ў 14:20.

**Алена ДРАПКО.**

# ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 228

Першая ліга чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па шашках-100 праходзіла з 23 да 29 верасня ў РЦАП па шахматах і шашках. У мужскім турніры ўпэўненую перамогу атрымаў майстар з Рэчыцы Рыгор Кулагін: 14 ачкоў з 18 магчымых. На другім месцы — гродзенскі майстар Сяргей Садоўскі: 13 ачкоў. Бронзавая ўзнагарода — у прадстаўніцы прыгожага полу майстра Анастасіі Сакаловай (Бабруйск), якая дала бой мужчынам і да апошняга тура прэтэндавала на перамогу ў турніры. У жаночым чэмпіянаце перамагла майстар з Віцебска Вікторыя Белая. «Серабро» ў прадстаўніцы Бабруйска Алесі Масюк, і бронзавая ўзнагарода дасталася гомельскаму майстру Ганне Барашка.

**№ 149**



**№ 149** В. Свідзінскі (Мінск)

**Белыя простыя:** c1, b2, f2, e3, g3, c5, g5, b6 (8)

**Чорныя простыя:** a3, h4, a5, e5, f6, a7, c7, e7, b8, d8 (10)

**№ 150** Д. Камчыцкі (Магілёў)

**Белыя простыя:** e1, b4, f4, h4, g5 (5)

**Чорныя простыя:** h2, d4, e5, b6, d6, h6, e7 (7)

Паглядзіце некалькі цікавых прыкладаў гульні з першай лігі ў шашкі-100

**№ 151** Р. Кулагін — В. Разаеў

**Белыя простыя:** 42, 43, 45, 36, 37, 38, 40, 31, 32, 34, 35, 26, 30, 25 (14)

**Чорныя простыя:** 28, 29, 23, 24, 16, 17, 18, 19, 14, 15, 8, 9, 10, 5 (14)

Белыя згулялі 31.31-27! і пагражаюць прарывам на флангу і пасля 08-12 правялі камбінацыю. Знайдзіце яе самастойна.

**№ 152** М. Крупкін — М. Пінчук

**Белыя простыя:** 48, 45, 36, 37, 38, 32, 33, 34, 35, 27, 28, 25 (12)

**Чорныя простыя:** 26, 21, 24, 16, 18, 19, 13, 6, 7, 8, 9, 10 (12). Белыя правялі разгромную камбінацыю, пакажыце яе.

Астатнія кампазіцыі складзены вядучым рубрыкі па правілах бразільскіх шашак.

**№ 153**

**Белыя простыя:** g1, b2, d2, f2, b4, c5 (6)

**Чорныя простыя:** g3, h4, e5, a7, e7, g7 (6)

**№ 154**

**Белыя простыя:** d2, f2, e3, b4, a5, c5, e7(7)

**Чорныя простыя:** a3, f4, h4, g5, d6, a7, g7, f8 (8)

**№ 155**

**Белыя простыя шашкі:** c3, b4, f4, b6, c7 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** h2, g3, d4, a5, e5, d6, f6, e7, b8 (9)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: Выпуск № 227 ад 27.09.2024.

№ 142 1 .b6-c7 d8:d4 2. a3:c5 f6:d8 3. b2-a3 d4:b6 4. a1-b2 h4:f6 5. d6-e7 f8:d6 6. h6:e7 d8:f6 7. b2-c3 d2:b4 8. a3:a7 f6-e5 9. a7-b8 e5-d4 10. b8-f4 d4-c3 11. f4-c1 +

№ 143 1. 38-32 27:29 2. 49-43 36:47 3. 43-38 47:33 4. 18-13 09:18

[4...29:18 5. 13:04 14:23 6. 04:12]

5. 23:03 14:23 6. 03:14 35-40 7. 14-03 05:14 8. 03:33 40-45 9. 33-50+

№ 144 13, 9, 4, 29, 29 x

№ 145 1. e3-d4 c5:c1 2. a7:e7 f8:d6 3. g5-h6 c1:g5 4. h6:h6 h2:f4 5. h6:e3 +

№ 146 1. a5-b6 c7:c3 2. e5:c7 d8:b6 3. f4-d6 h2:f4 4. d6:a5 a3-b2 5. a5-c3 b2:d4 6. e1-d2 h6-g5 7. d2-e3 d4:f2 8. g1:e3 g5-h4 9. e3-f4+

№ 147 1. d6-e7 f8:b4 2. h6:e3 a7:c5 3. e3:b6 g5:e3 4. b6:g1+

№ 148 1. d6-e7 f8:b4 2. h6:f8 g5:e3 3. f8:a3 h2:f4 4. b2-c3 d2:b4 5. a3:f2+

Першымі дакладныя адказы даслалі: І. Ананіч (Гродна), В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013.**

**e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Чым здольныя здзіўляць дзяўчаты?

## Што цікавага на здымачнай пляцоўцы рэаліці-шоу

**Доўгачаканы фінал другога сезона рэаліці-шоу «Ёсць дзяўчына адна», якое выходзіць на тэлеканале «РТР-Беларусь», здымаўся днямі ў Мінску. Гэта, як кажуць, самы жаночы праект на беларускім тэлебачанні, у якім сёлета за званне найлепшай і грашовы прыз змагаліся пяць фіналістак — прадстаўніц самых розных прафесій: Наталля Рэмез, Кацярына Крылова, Марына Мамаева, Настасся Грышчанок і Юлія Серабракова.**



Для ўдзельніц у фінале падрыхтавалі шэраг цікавых конкурсаў, у якіх неабходна было праявіць сябе інтэлектуальна, творча і нават фізічна. Сваімі эмоцыямі за крок да заключнага этапу падзялілася **фіналістка Марына МАМАЕВА:**

— Я пад вялікім уражаннем ад здымачнага працэсу. Ніколі ў такой атмасферы раней не бывала, тут вельмі цікава! На прадпрыемстве, дзе я працую, прапанавалі паўдзельнічаць у кастынгу — пагадзілася, але ўсё ж спачатку было неяк боязна, таму што ніколі не працавала перад камерамі. Узнікалі думкі: «Ці змагу?» Але, бачыце, як здарылася — трапіла ў фінал і ні аб чым не шкадую.

Прыадкрыем заслону тайны: на адным з заключных этапаў дзяўчатам прапанавалі сыграць на музычных інструментах з Прэзідэнцкім аркестрам Беларусі. Здаецца, калектыў прафесіяналаў і ўсё дакладна павінна атрымацца, але ж на тое яно і рэаліці-шоу, каб стварыць нешта незвычайнае, тое, аб чым нават не здагадваліся нашы дзяўчаты. На якім інструменце будзе іграць кожная з іх і пад якую музычную кампазіцыю, было таямніцай. Каробачка, лыжкі, дудачка — і гэта далёка не ўсе варыянты. Дарэчы, члены журы пры падвядзенні вынікаў гэтага этапу ўлічвалі не толькі валоданне інструментам, але і ўзаемадзеянне з аркестрам, харызму, эмацыянальнасць.

Шмат у чым удзельніцы праявілі сябе падчас фіналу: і танцавалі, і гралі на музычных інструментах, але чым яшчэ славяцца беларускія дзяўчаты, дык гэта сваім уменнем гатаваць. Нашы дранікі, пагадзіцеся, самыя смачныя.

Па выніках аднаго з конкурсаў і даведаліся, у каго ж атрымалася прыгатаваць іх найлепш. Скажам адразу, нашы фіналісткі не толькі цудоўныя гаспадыні, але яшчэ і кемлівыя: адказваць на пытанні вядучага па школьнай праграме падчас прыгатавання традыцыйнай беларускай стравы ў іх атрымлівалася на «ўра».

Час праляцеў незаўважна. А складанае рашэнне аб тым, хто стане пераможцай, давялося прымаць паважаным членам журы, у склад якога ўвайшлі дырэктар «Музычнай медыякампаніі» Андрэй Гузель, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Дзмітрый Шаўцоў, старшыня Федэрацыі хакея Беларусі, алімпійскі чэмпіён Аляксандр Баграновіч, міністр сельскай гаспадаркі Анатоль Ліневіч і старшыня Беларускага саюза жанчын Вольга Шпілеўская. Самыя таленавітыя, дасціпныя, разумныя, шчырыя — пяцёра фіналістак паказалі сябе па максімуме. А хто з іх заслужана будзе насіць званне пераможцы другога сезона шоу, даведаемся 7 снежня на тэлеканале «РТР-Беларусь».

**Яна ВАЛАСАЧ, фота аўтара.**


# Смачная восень са «Звяздой»!

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або на II паўгоддзе 2024 года, запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 24 кастрычніка 2024 года (па паштовым штэмпелі атрымання) у рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем сокавыціскалак Kitfort KT-1150-1 і суперпрыз — сушылка для агародніны і садавіны Kitfort KT-FP-1940.

Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 4 лістапада 2024 года.





Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2024 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або на II паўгоддзе 2024 года. Пасля 31 снежня 2024 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 167 ад 28 жніўня 2024 года.

**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4265 ад 1.12.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або на II паўгоддзе 2024 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________________
*(аддзяленне сувязі)*

____________ **на IV квартал або на II паўгоддзе 2024 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* [ ] *(індэкс)* ________

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.25** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.20, 23.40** Зона Х (16+).
**8.50** Слова Мітрапаліта Веніяміна на свята Пакроў Прасвятой Багародзіцы.
**9.20** Галоўны эфір.
**10.55, 12.25 Меладрама «Сын» (12+).**
**13.15, 15.25 Меладрама «Знайдзі нас, мама!» (12+)**
**15.15, 18.45** Навіны рэгіёна.
**17.45** Беларуская часінка.
**19.10 Меладрама «Позняе раскаянне» (16+).**
**20.55** «Фактар.by».
**21.00** Панарама.
**21.50** Зразумелая палітыка.
**22.05** Святочны канцэрт да Дня маці (6+).
**0.00 Серыял «След» (16+).**

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.10** Наш час.
**10.15** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.10** «Белыя Росы» (12+).
**12.40, 13.15, 22.55 Фільм «Цыганка» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Яшчэ не вечар» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.20** «Прапаганда» (16+).
**21.40** Фільм «Адно жыццё на дваіх» (12+).
**1.00** «Спартклуб» (16+).
**1.20** Час.
**2.05** Заканчэнне эфіру.

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Тыдзень».
**10.20** «Слова і справа».
**10.40** Дак. праект «Без падману» (16+).
**13.50, 0.50 «Стажоры». Серыял (16+).**
**16.50** «Міншчына».
**17.00 «Хуткая дапамога-5». Серыял (16+).**
**18.30** «Па сутнасці».
**20.15** «Дзермант. «Сэнсы».
**20.25, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45 «Неўскі». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. «Напрамую».

## МІР

**5.00, 6.10 Тэлесерыял «Метад Фрэйда» (16+).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны
**9.00** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**9.35, 10.20 Маст. фільм «Хаджэнне за тры моры» (16+).**
**10.10** «Беларускі стандарт» (12+).
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.50** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.45** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**22.30** Маст. фільм «Добры дзень, я ваша цётка» (16+).
**0.40** «Наша кіно. Неўвядальныя» (16+).
**1.00** Першы Еўразійскі канал (12+).
**2.10 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**4.50 Тэлесерыял «Чорныя ваўкі» (16+).**

## Першы Інфармацыйны

**5.00, 6.05** Галоўны эфір.
